**Алесь ДУБРОЎСКІ**



Алесь Дуброўскі нарадзіўся ў 1948 годзе ў вёсцы Целяшы Гомельскага раёна.

Дзіцячая памяць — самая ўчэпістая і даўгавечная. Малое засёды цягнецца да дарослых, а тыя напрыканцы саракавых і на пачатку пяцідзесятых у большасці сваёй былі якраз салдатамі мінулай вайны. Многія з іх яшчэ не развіталіся з вайсковай формам, не пазнімалі ордэнаў і медалёў, а побач тыя, каму не пашанцавала ў былой бойні — інваліды на драўляных мыліцах, пазначаныя асколкамі і кулямі, шрамы ад якіх не сатруцца да канца жыцця. 1 яшчэ — успаміны гэтых людзей, бацькоў, на долю якіх выпалі змрочныя гады акупацыі. Дзіцячая памяць засвоіла ўсё гэта да лрабніц. Адсюль і ваенная тэма ў вершах, напісаных значна пазней.

Вершы Алеся Дуброўскага друкаваліся ў ‘Томельскай праўдзе” і “Чырвонай змене”, “Сельской газете” і “Знамя юности”, часопісе “Маладосць”.